ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

**Сяргей НОВІКАЎ**

# Лепельская аперацыя летам 1941 года: спроба навуковай інтэрпрэтацыі

*Нягледзячы на тое, што многія старонкі Вялікай Айчыннай вайны ўжо добра даследаваны навукоўцамі, застаецца яшчэ цэлы шэраг пытанняў і праблем, якія чакаюць сваіх даследчыкаў. Адной з іх з'яўляецца гісторыя Лепельскай аперацыі ў пачатку ліпеня 1941 г., якую ў СМІ і літаратуры часам называюць танкавай бітвай пад Сянно.*

У савецкай гістарычнай навуцы пра лакальныя контрудары Заходняга фронту на лепельскім напрамку ў ліпені 1941 г. не любілі ўзгадваць, паколькі падчас іх два механізаваныя корпусы Чырвонай Арміі панеслі значныя страты ў салдатах і баявой тэхніцы. Сучасныя ж ацэнкі тых маладаследаваных падзей часта гучаць без неабходнага навуковага абгрунтавання.

Так, 6 верасня 2011 г. з нагоды 70-й гадавіны тых жорсткіх баёў у Сянно быў адкрыты памятны манумент савецкім воінам-танкістам (на пастаменце яго ўстаноўлены танк ІС-3*). Як адзначалася на цырымоніі ўрачыстага адкрыцця помніка, танкавая бітва пад Сянно з'явілася *самай буйной танкавай бітвай у сусветнай гісторыі,* дзякуючы якой у пачатку Вялікай Айчыннай вайны быў стрыманы імклівы рух гітлераўскіх войскаў на Маскву. У СМІ паведамлялася, што ў жорсткім баі сышліся больш за 2 тыс. баявых машын з савецкага і нямецкага бакоў, што значна пераўзыходзіць колькасць тэхнікі, якая ўдзельнічала ў знакамітай бітве пад Прахараўкай на Курскай дузе летам 1943 г.[1] (У дачыненні да апошняга адразу ж заўважым, што ў баях пад Прахараўкай сінхранізавана па часе і прасторы адначасова з абодвух бакоў удзельнічалі да 1200 танкаў і самаходных гармат[2]).

У святле гэтага неабходна задумацца, чаму танкавая бітва пад украінскімі гарадамі Брады, Дубна, Роўна і Луцк, якая адбылася з 23 па 29 чэрвеня 1941 г., знайшла сваё адлюстраванне ў савецкай энцыклапедыі 1985 г. "Великая Отечественная война 1941—1945 гг."[3], тады як *аб танкавай бітве пад Сянно* на Віцебшчыне не напісана ні аднаго (!) радка. Заўважым таксама, што "самая буйная танкавая бітва ў сусветнай гісторыі" па нейкіх прычынах абыдзена маўчаннем і ў найноўшым расійскім энцыклапедычным выданні "Великая Отечественная война: Энциклопедия" (М., 2010)[4].

Нельга сказаць, што баявыя дзеянні на Віцебшчыне ў пачатку ліпеня 1941 г. цалкам заставаліся па-за ўвагай навуковай грамадскасці. Аднак за 70 пасляваенных гадоў "танкавая бітва з удзелам больш

* Вытворчасць такіх баявых машын пачалася ў СССР толькі ў 1943 г.



***НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч.***
*Загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1954 г. у в. Радзіца Крупскага раёна Мінскай вобласці, у 1980 г. закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны і крыніцазнаўства. Аўтар манаграфій "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004). З'яўляецца сарэдактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць" (Вып. 1—10, Мн., 2002—2012).*

за 2 тыс. баявых машын" (як адзначаецца ў літаратуры) чамусьці не стала тэмай для асобнай манаграфіі альбо дысертацыйнага даследавання, не абмяркоўвалася як цэнтральная праблема на спецыяльнай навуковай канферэнцыі. Аўтарам выяўлены толькі адзін спецыяльны артыкул на згаданую тэму, падрыхтаваны ў 1971 г. для "Военно-исторического журнала" Міністэрства абароны СССР былым удзельнікам баёў В.Бутковым[5]. Акрамя гэтай публікацыі баявыя дзеянні пад Сянно ў рознай ступені закранаюцца ў некаторых калектыўных, энцыклапедычных і мемуарных выданнях. Але ў цэлым танкавыя баі на Віцебшчыне ў ліпені 1941 г. пакуль застаюцца практычна малавядомай тэмай нават для прафесійных гісторыкаў.

Адной з аб'ектыўных прычын такога становішча можна лічыць закрытасць архіўных фондаў ваеннага ведамства ў савецкі час. Так, дакументы аператыўнага аддзела штаба Заходняга фронту, у тым ліку дзённікі баявых дзеянняў 5-га механізаванага корпуса, былі рассакрэчаны толькі ў лістападзе 2000 г. Другая прычына — невыкарыстанне айчыннымі гісторыкамі замежных дакументальных крыніц.

У выніку да гэтага часу застаюцца адкрытымі наступныя пытанні:

1. Аб храналагічных рамках танкавых баёў на Віцебшчыне. (У айчыннай гістарыяграфіі сустракаюцца наступныя: 6—9, 6—10, 6—11 ліпеня 1941 г.);
2. Аб агульнай колькасці танкаў, якія ўдзельнічалі з абодвух бакоў у баях пад Сянно. (У айчыннай гістарыяграфіі падаюцца наступныя звесткі: каля 1 тыс., да 1,3 тыс., 1,5 тыс., больш за 2 тыс., 2770 і нават да 3 тыс. баявых машын);
3. Аб ступені сінхроннасці праведзеных контрудараў і ўзаемадзеяння паміж 5-м і 7-м механізаванымі карпусамі (МК) у ходзе Лепельскай аперацыі 1941 г.;
4. Аб стратах, панесеных з абодвух бакоў у ходзе танкавых баёў на Віцебшчыне;
5. Аб аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах фактычнага разгрому двух механізаваных карпусоў Чырвонай Арміі падчас контрудараў на лепельскім напрамку;
6. Аб аператыўна-тактычным значэнні Лепельскай аперацыі. (Што вельмі важна ў кантэксце замацавання ў сучаснай літаратуры тэзісу аб "самай буйной танкавай бітве ў сусветнай гісторыі").

Паспрабуем прасачыць гісторыю даследавання бітвы пад Сянно ў айчыннай гістарыяграфіі.

## Савецкая гістарыяграфія

Падмурак савецкай гістарыяграфіі быў закладзены ў 6-томнай працы "История Великой Отечественной войны Советского Союза 1941—1945" (1960—1965). У другім яе томе змешчаны звесткі пра контрудар, праведзены на лепельскім напрамку 5-м і 7-м механізаванымі карпусамі 20-й арміі па загаду камандавання Заходняга фронту[6]. Адзначаецца, што з савецкага боку было задзейнічана каля 1 тыс. танкаў старога тыпу. З 6 па 10 ліпеня яны наносілі ўдар у фланг войскам 3-й нямецкай танкавай групы на поўнач і захад ад Оршы. У выніку яго праціўнік панёс вялікія страты і да поўдня 8 ліпеня быў адкінуты на 30—40 км у бок Лепеля. Пры гэтым адзначаецца, што ў раёне Сянно савецкія войскі сустрэлі ўпартае супраціўленне нямецкіх злучэнняў 47-га матарызаванага корпуса* і "буйнога дэсанту". 10 ліпеня савецкія войскі былі выведзены з бою. Сярод прычын няўдалага правядзення контрудару аўтары адзначалі *"дрэнную арганізацыю ўзаемадзеяння паміж 7-м і 5-м механізаванымі карпусамі"*. Як вынік, 7-ы корпус быў спынены на паўночна-ўсходніх падыходах да Сянно, а войскі 5-га вялі на працягу 9—10 ліпеня цяжкія абарончыя баі амаль у поўным акружэнні, з якога здолелі выйсці дзякуючы па-майстэрску арганізаванаму вываду войскаў[7].

У 1962 г. савецкі гісторык В.Анфілаў паказаў у сваім ваенна-гістарычным нарысе "Начало Великой Отечественной войны (22 июня — середина июля 1941 года)" агульную схему баявых дзеянняў 7-га і 5-га механізаваных карпусоў на працягу 6—9 ліпеня 1941 г. Перад карпусамі была пастаўлена задача знішчыць нямецкую групоўку, што вяла наступленне з раёна Лепеля ў напрамку Віцебска. Для гэтага трэба было нанесці контрудар з раёна паміж Віцебскам і Оршай у напрамку на Сянно, Лепель[8]. Даследчык адзначае, што найбольш упартыя і жорсткія баі разгарнуліся ў раёне на поўдзень ад Сянно[9]. На аснове дакументаў архіва Міністэрства абароны СССР прыведзены даныя, што ў 5-га корпуса да пачатку наступлення было каля 300 танкаў, а ў 7-га — больш за 400 (значыць, разам 700 танкаў. — **С.Н.**). З нямецкага боку дзейнічала прыкладна столькі ж танкаў, у паветры панавала нямецкая авіяцыя. Такую карціну баявых дзеянняў В.Анфілаў прыводзіў і праз чвэрць стагоддзя, у канцы 1980-х гг.[10].

Знакавым у савецкай гістарыяграфіі можна назваць артыкул "Контрудар 5-го механизированного корпуса на лепельском направлении (6—11 июля 1941 года)"[11], апублікаваны былым начальнікам штаба названага корпуса, Героем Савецкага Саюза В.Бутковым у 1971 г. Ён падрыхтаваны пераважна на аснове ўласных успамінаў, але з выкарыстаннем дакументаў з архіва Міністэрства абароны СССР. У артыкуле даецца штодзённае апісанне ходу баявых дзеянняў 5-га корпуса на лепельскім напрамку на працягу амаль цэлага тыдня, з 6 па 11 ліпеня 1941 г. Пры гэтым аўтар адзначае, што ў 5-м і 7-м механізаваных карпусах мелася больш за 700 танкаў старых тыпаў[12], у той час як лепельскую групоўку нямецкіх войскаў складалі 5 танкавых дывізій, што мелі больш за 1000 танкаў. В.Буткоў адзначыў, што агульныя страты 5-га механізаванага корпуса ў людзях і тэхніцы склалі каля 60%[13]. (Нагадаем, што цалкам укамплектаваныя асабовым складам і баявой тэхнікай савецкія механізаваныя карпусы складалі ад 31 да 36 тыс. чалавек.)

* Пад Сянно дзейнічалі толькі асобныя часці 17-й нямецкай танкавай дывізіі (адной з дзвюх танкавых дывізій 47-га корпуса 2-й танкавай групы).

Акрамя падрабязных звестак аб баявых дзеяннях 13-й і 17-й танкавых дывізій 5-га механізаванага корпуса В.Буткоў прывёў таксама даныя аб дзеяннях 14-й танкавай дывізіі 7-га корпуса, на рубяжы наступлення якой савецкія войскі пераўзыходзілі нямецкія: па людзях — у 2 разы, па артылерыі — у 3 разы, па танках — у 3—4 разы[14].

Падсумоўваючы вынікі танкавых баёў, В.Буткоў быў перакананы, што ў выніку контрудару 5-га корпуса на лепельскім напрамку часці 47-га нямецкага матарызаванага корпуса панеслі вялізныя страты, што значна зменшыла іх ударную сілу і тэмп руху на ўсход. У ходзе баёў 13-й і 17-й савецкіх танкавых дывізій перавага была на баку немцаў, паколькі ў паветры непадзельна панавала авіяцыя праціўніка. У канцы артыкула В.Буткоў назваў галоўныя недахопы ў арганізацыі контрудару на лепельскім напрамку. Малы тэрмін, адведзены на падрыхтоўку наступлення, не дазволіў наладзіць цеснае ўзаемадзеянне паміж 5-м і 7-м механізаванымі карпусамі, у выніку чаго яны дзейнічалі адасоблена на розных напрамках[15].

Фактычны матэрыял, уведзены ў публікацыі В.Буткова, у далейшым быў выкарыстаны Л.Чапурновай для падрыхтоўкі артыкулаў "Лепельскі контрудар" у беларускіх энцыклапедычных выданнях[16], А.Стэльмах для напісання матэрыялу "Лепельскі контрудар 1941" у гісторыка-дакументальнай хроніцы "Памяць"[17], Р.Ірынархавым у кнізе "Западный Особый..."[18]. На жаль, некаторыя іншыя аўтары пры даследаванні гісторыі Лепельскага контрудару не надаюць публікацыі В.Буткова належнай увагі.

У сярэдзіне 1970-х гг. звесткі аб баявых дзеяннях у раёне Сянно трапляюць літаральна адным абзацам на старонкі 12-томнай калектыўнай працы "История Второй мировой войны 1939—1945"[19]. У ёй пазначалася, што з 6 па 10 ліпеня 5-ы і 7-ы механізаваныя карпусы 20-й арміі генерала П.Курачкіна нанеслі контрудар па дывізіях 3-й танкавай групы на лепельскім напрамку ў раёне Сянно і затрымалі іх на некалькі дзён. Да 10 ліпеня нямецкія дывізіі выйшлі на подступы да Полацка, Віцебска, Оршы[20]. У 1980-я гг. тэзіс аб контрудары часцей 20-й арміі на лепельскім напрамку ў раёне Сянно па нямецкіх дывізіях 3-й танкавай групы заставаўся нязменным[21].

Адметнымі ў плане паказу тых падзей можна лічыць мемуары, якія пакінуў былы начальнік штаба 13-й арміі* генерал С.Іваноў. У кнізе "Штаб армейский, штаб фронтовой"[22] ён увёў новыя звесткі аб колькасці танкаў у 5-м і 7-м механізаваных карпусах. Са спасылкай на камандуючага 20-й арміяй генерала П.Курачкіна і начальніка штаба М.Карнеева ў кнізе прыводзяцца такія даныя: у 5-м корпусе на ўліку знаходзіліся 924 танкі, а ў 7-м — 715. З іх у бой маглі ўступіць каля 1400 машын, пераважна састарэлых канструкцый БТ-7 і Т-26[23]. С.Іваноў прыйшоў да высновы, што ў ходзе Лепельскага контрудару па флангу і ў тыл полацкай групоўкі былі беззваротна страчаны больш за 50% машын, згублены два корпусы, і фактычна на заходнім напрамку больш не засталося колькі-небудзь баяздольных танкавых злучэнняў[24]. Заўважым, аднак, што поўнай карціны баявых дзеянняў аўтару ўспамінаў стварыць не ўдалося.

## Сучасная расійская гістарыяграфія

У сучаснай расійскай гістарыяграфіі захоўваюцца ацэнкі, што замацаваліся ў раней апублікаваных працах. Так, у 4-томнай працы "Великая Отечественная война. 1941—1945" (М., 1998) адзначаецца агульнапрыняты факт контрудару двух карпусоў Заходняга фронту на лепельскім напрамку[25]. Пры гэтым на падставе дакументаў Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны РФ уведзены новыя лічбы аб колькасці танкаў. Адзначаецца, што савецкія часці пераўзыходзілі праціўніка ў сілах, маючы 1,3 тыс. танкаў. На працягу 4 сутак баёў былі страчаны 832 танкі. Пры гэтым аўтары заўважаюць, што ў дакументах таго часу аб людскіх стратах не паведамлялася[26].

Контрудар на лепельскім напрамку прыцягнуў увагу і калектыву найноўшай 12-томнай працы "Великая Отечественная война 1941—1945 годов" (М., 2011)[27]. Аўтары пішуць, што ў контрударах удзельнічалі 5-ы і 7-ы механізаваныя карпусы, якія мелі каля 1 тыс. танкаў старых тыпаў. Чацвёра сутак ішлі ўпартыя баі. Для адбіцця ўдару немцы былі вымушаны кінуць 5 дывізій і амаль увесь 2-і паветраны флот. 9 ліпеня праціўнік захапіў Віцебск, і савецкае наступленне было спынена. 5-ы і 7-ы карпусы страцілі 832 танкі[28]. Відавочна, што аўтары найноўшай працы адсылаюць чытача да некаторых даных, уведзеных у навуковы зварот 50 гадоў таму, хоць у дачыненні да панесеных страт выкарыстоўваюць лічбу, уведзеную расійскімі гісторыкамі ў канцы 1990-х гг.

## Беларуская гістарыяграфія савецкага часу

У беларускай савецкай гістарыяграфіі першыя звесткі пра баявыя дзеянні пад Сянно і Лепелем з'явіліся толькі ў сярэдзіне 1970-х гг. У 6-м томе 12-томнай "Беларускай савецкай энцыклапедыі" (1972 г.)[29] не было ніводнага радка аб Лепельскім контрудары, а ўжо праз тры гады ў заключным томе гэтай жа энцыклапедыі[30] ў матэрыяле аб абарончых баях на тэрыторыі Беларусі ў ліпені—жніўні 1941 г. былі ўзгаданы баі на віцебскім напрамку ў раёне Лепель—Сянно. Як напісаў гісторык І.Марчанка, тут разгарнулася адна з вялікіх танкавых бітваў пачатку вайны, у якой з абодвух бакоў удзельнічала больш за 1,5 тыс. танкаў. 8 ліпеня вораг быў адкінуты на 30—40 км у напрамку Лепеля. Тэрмінова падцягнутыя рэзервы ворага і "буйны паветраны дэсант" прымусілі савецкія войскі адступіць[31].

У фундаментальнай 5-томнай "Гісторыі Беларускай ССР" (1975) былі прыведзены толькі агульныя звесткі аб тых падзеях. У матэрыяле Э.Языковіч і В.Раманоўскага апісваліся ўпартыя баі, якія ў пачатку ліпеня разгарнуліся ў раёне Орша—Сянно, дзе войскі 20-й арміі сіламі двух механізаваных карпусоў 6 ліпеня нанеслі контрудар па варожых войсках

* Пазіцыі 13-й арміі знаходзіліся побач з пазіцыямі 20-й арміі.

3-й танкавай групы. Асабліва жорсткія бai разгарнуліся ў раёне вёсак Трубаносы, Новае Сяло і іншых населеных пунктаў. 8 ліпеня савецкія танкісты і артылерысты разграмілі тут варожую танкавую калону. Вораг быў адкінуты ў напрамку Лепеля на 30—40 км. Немцы падцягнулі рэзервы, і савецкія войскі вымушаны былі адступіць[32]. Тэзіс аб нанясенні контрудару часцямі 20-й арміі пад камандаваннем генерал-лейтэнанта П.Курачкіна 6 ліпеня па войсках 3-й танкавай групы, а таксама аб затрымцы ворага на некалькі дзён на Віцебшчыне паўтараецца і ў іншых акадэмічных выданнях канца 1970-х гг.[33].

Крыху больш дэталёвую карціну тых падзей падала Л.Чапурнова ў артыкуле "Лепельскі контрудар 1941" першага тома кароткай энцыклапеды "Беларуская ССР" (1978)[34]. У ім адзначаецца, што контрудар быў нанесены з раёна Багушэўска на паўднёвы захад ад Віцебска ў напрамку на Сянно і Лепель па 3-й танкавай групе нямецкіх войскаў. Злучэнні 5-га і 7-га карпусоў выйшлі ў раён Сянно, вызвалілі горад, прасунуліся на 30—40 км, разграмілі 2 нямецкія матарызаваныя палкі, знішчылі ў ходзе баёў на лепельскім напрамку нямецкую матарызаваную дывізію, да 40 гармат, значную колькасць транспартных сродкаў праціўніка. Найбольш упартыя баі, у тым ліку танкавыя (з абодвух бакоў удзельнічала да 1,5 тыс. танкаў) ішлі ў раёне на поўнач ад Сянно. Падцягнутыя немцамі рэзервы і моцная падтрымка авіяцыі прымусілі савецкія войскі спыніць наступленне, і 10 ліпеня яны адышлі ў раён Оршы. У выніку контрудару была значна зменшана ўдарная сіла нямецкіх войскаў і тэмп іх прасоўвання на ўсход[35].

У далейшым гэты падыход быў замацаваны ў энцыклапедыі "Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны, 1941—1945 гг." (Мн., 1990)[36] і 6-томнай "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" (Мн., 1997)[37].

### Сучасная беларуская гістарыяграфія

У канцы 1990-х гг. краязнаўца А.Стэльмах падрыхтавала матэрыял "Лепельскі контрудар 1941 года", які ўвайшоў у гісторыка-дакументальную хроніку "Памяць" Лепельскага раёна. Аснову яго склада фактaлагічная база артыкула В.Буткова. Аўтар адзначыла, што пад Сянно адбылася *адна з самых буйных у пачатковы перыяд вайны танкавых бітваў, у якой з абодвух бакоў удзельнічала да 1,5 тыс. танкаў*[38]. Не маючы дастатковых дакументальных сведчанняў, Л.Стэльмах пакінула нязменнай лічбу аб агульнай колькасці танкаў, уведзеную ў канцы 1970-х гг. Л.Чапурновай.

Заўважым, аднак, што ні Л.Чапурновай, ні А.Стэльмах не было зроблена аніякіх спасылак на дакументальныя ці гістарыяграфічныя крыніцы, на падставе якіх можна было б прыйсці да новых высноў. Такім чынам, да канца XX ст. беларускім даследчыкам не ўдалося аднавіць на навуковай аснове ход падзей, звязаных з Лепельскім контрударам 1941 г.

Высвятленне фактычнай колькасці савецкіх баявых машын, якія ўдзельнічалі ў ходзе Лепельскага контрудару, прадоўжылася ў 2000-я гг. Так, свой погляд на тыя падзеі прапанаваў у кнізе "Танковый погром. (Куда исчезли 28 тысяч советских танков)" У.Бяшанаў[39]. Ён звузіў храналагічныя рамкі контрудару з 6 па 9 ліпеня. Акрамя таго, у кнізе (без спасылак на дакументальныя крыніцы) уведзены новыя лічбы аб колькасці танкаў у 5-м і 7-м механізаваных карпусах. Аўтар адзначае, што ў складзе 4 танкавых і адной мотастралковай дывізіі было 1770 танкаў (большасць з іх састарэлых тыпаў БТ-7 і Т-26). Ён таксама піша (зноў без спасылак на дакументы), што ў нямецкага боку на ўзбраенні было да 1 тыс. танкаў лепшых канструкцый[40]. У.Бяшанаў перакананы, што контрнаступленне двух савецкіх карпусоў цалкам правалілася.

Лічба ў 1770 танкаў згадваецца і ў найноўшым акадэмічным выданні "Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945" (Мн., 2005)[41]. У матэрыяле, падрыхтаваным прафесійным ваенным гісторыкам А.Літвіным, адзначаецца, што контрудар, распачаты 6 ліпеня 1941 г., у савецкай літаратуры падаваўся як адна з найбуйнейшых танкавых бітваў пачатковага перыяду вайны, у якой з абодвух бакоў удзельнічала не менш за 1,5 тыс. танкаў. У ходзе 5-дзённых баёў часці Чырвонай Арміі ў пэўнай ступені ахaладзілі наступаючы пыл ворага: яны прасунуліся на 30—60 км у раён Сянно, разграмілі 2 матарызаваныя палкі і нанеслі вялікія страты войскам праціўніка. Пры гэтым А.Літвін адзначае, што заплачаная за поспехі цана была вельмі высокай: 5-ы і 7-ы механізаваныя карпусы страцілі 832 танкі[42]. Так у беларускую гістарыяграфію са спасылкай на расійскае 4-томнае выданне была ўпершыню ўведзена лічба фактычных страт, панесеных савецкім бокам у ходзе Лепельскага контрудару. Пры гэтым, аднак, заставалася нерастлумачаным паходжанне гэтай лічбы.

Што тычыцца колькасці танкаў, якія з абодвух бакоў удзельнічалі ў Лепельскім контрудары, то ў беларускай навуцы пакуль няма адзінага погляду па гэтым пытанні. Так, у найноўшым 6-томным энцыклапедычным выданні "Республика Беларусь"[43] у артыкуле "Лепельский контрудар 1941" адзначаецца, што ў складзе 5-га і 7-га карпусоў было каля 1770 танкаў (пераважна састарэлых БТ-7 і Т-26). Усяго ж у жорсткіх баях на поўдзень ад Сянно з абодвух бакоў удзельнічалі, па розных ацэнках, ад 1,5 да 3 тыс. танкаў і бронеаўтамабіляў. У матэрыяле зазначана таксама, што савецкія войскі пераўзыходзілі праціўніка па колькасці танкаў. 7 ліпеня савецкія войскі ўзялі Лепель. Аднак з-за адсутнасці рэгулярнай падтрымкі з паветра і праблем з забеспячэннем палівам і боезапасамі яны былі вымушаны спыніць наступленне. 8 ліпеня немцы зноў занялі Сянно, 10 ліпеня — Лепель, савецкія часці адышлі да Оршы[44].

З апорай на ранейшыя публікацыі быў падрыхтаваны матэрыял для "Ваеннай энцыклапедыі Беларусі"[45]. У ім Лепельскі контрудар 1941 г. упершыню падаецца як *Лепельска-Сенненскі контрудар,* праведзены 6—10 ліпеня з мэтай разгрому групоўкі ворага, якая наступала ў напрамку Віцебска. Адзначаецца, што найбольш упартыя баі, у тым ліку танкавыя (удзельнічала да 1,5 тыс. танкаў), ішлі на поўнач ад Сянно (5-ы механізаваны корпус у складзе трох

дывізій вёў баявыя дзеянні выключна ўздоўж чыгуначнай веткі Орша—Лепель. — **С.Н.**). У выніку контрудару праціўніку нанесены страты, значна зменшаны яго ўдарныя сілы і тэмп прасоўвання на ўсход. Савецкім карпусам давялося вырывацца з акружэння ў раёне Оршы[46].

Такім чынам, напрацаваныя беларускай гістарыяграфіяй матэрыялы толькі ўдакладняюць асноўнае факталагічнае поле аб баявых дзеяннях 5-га і 7-га механізаваных карпусоў Чырвонай Арміі пад Сянно. Канцэптуальна ж падзеі разглядаюцца выключна ў рамках правядзення 20-й арміяй Лепельскага контрудару, прычым асноўная ўвага факусіруецца на баявых падзеях у раёне Сянно. Пры гэтым застаюцца адкрытымі некаторыя важныя пытанні аб ходзе баявых дзеянняў з абодвух бакоў, а таксама ацэнкі іх фактычных вынікаў. Відавочна, што ў далейшым ход баявых дзеянняў неабходна даследаваць на аснове як айчынных, так і замежных дакументальных крыніц.

Важны крок у гэтым напрамку быў зроблены выканаўцамі беларуска-расійска-украінскага праекта "1941 год: Страна в огне" (М., 2011)[47]. Аўтары раздзела "Бітва за Беларусь летам 1941 года" А.Літвін і І.Варанкова выкарысталі для сваёй працы сярод іншых нямецкія крыніцы (хоць у асноўным мемуарнага характару), а таксама малавядомыя факты, якія прывёў былы начальнік штаба 13-й арміі генерал С.Іваноў. Выкарыстаныя звесткі дазволілі ім пастывіць пад сумненне аператыўныя вынікі "так званага контрудару танкаў 5-га МК"[48], назваць гістарычным фактам "разгром мехкарпусоў пад Лепелем" і пераканацца ў тым, што *"задуманы камандаваннем Заходняга фронту і безумоўна ўхвалены Стаўкай контрудар двух механізаваных карпусоў не толькі пацярпеў поўнае фіяска, але і пакінуў войскі фронту практычна без танкаў"*[49].

На наш погляд, гісторыкам удалося зрабіць якасны крок у напрамку да аб'ектыўнага вывучэння гісторыі Лепельскага контрудару, па-новаму паказаць яго асобныя аспекты, у тым ліку назваць некаторыя малавядомыя факты. Яны адзначаюць, што ў 5-м і 7-м савецкіх механізаваных карпусах было каля 1400 машын, якія былі задзейнічаны ў ходзе контрудару на лепельскім напрамку. Атрымліваецца, што аўтары адыходзяць ад папярэдняй лічбы, адпаведна якой агульная колькасць баявых машын з абодвух бакоў складала не менш за 1,5 тыс. танкаў[50]. У дачыненні да панесеных савецкім бокам баявых страт аўтары перакананы, што два корпусы страцілі не палову, а амаль $^{2}/_{3}$ ад парка баявых машын (з 1639 машын баяздольнымі лічылася каля 1400 баявых адзінак). Акрамя таго, даследчыкі паспрабавалі крытычна ацаніць факт разгрому двух танкавых злучэнняў, выявіць яго як аб'ектыўныя, так і суб'ектыўныя прычыны.

На багатай дакументальнай базе крыніц паказвае ход Лепельскага контрудару падпалкоўнік Р.Ірынархаў у сваёй кнізе "Агония 1941. Кровавые дороги отступления" (М., 2011). У цэлым ён прытрымліваецца падыходаў і ацэнак, уведзеных у гістарыяграфію былым начальнікам штаба 13-й арміі генералам С.Івановым[51].

Такім чынам, нягледзячы на наяўнасць агульных публікацый (выключэнне складае артыкул В.Буткова) і пэўных фактаў у калектыўных працах, дзе закранаецца гісторыя контрудару ў раёне Сянно—Лепель, пакуль нельга казаць, што ў айчыннай гістарыяграфіі існуе дастаткова поўнае навуковае даследаванне танкавых баёў пачатку ліпеня 1941 г. Без уліку дакументаў нямецкага боку практычна немагчыма аднавіць ход баявых дзеянняў і наблізіцца да поўнага апісання характару тых падзей.

Паспрабуем прадставіць вядомыя нам гістарыяграфічныя звесткі ў выглядзе зводнай табліцы.

*Табліца 1*

**Зводныя даныя пра Лепельскі контрудар летам 1941 г.**

| Аўтар | Храналогія | Колькасць танкаў | Страты савецкага боку |
|---|---|---|---|
| Анфілаў В.А. | 6–9 ліпеня 1941 г. | каля 700 савецкіх танкаў | Вялікія страты |
| 6-томная гісторыя Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг. | 6–10 ліпеня 1941 г. | каля 1000 савецкіх танкаў | Вялікія страты |
| Буткоў В.В. | 6–11 ліпеня 1941 г. | больш за 700 савецкіх танкаў | Каля 60% у жывой сіле і тэхніцы |
| Чапурнова Л.У. | 6–10 ліпеня 1941 г. | да 1500 танкаў з абодвух бакоў | Вялікія страты |
| Іваноў С.П. | 6–9 ліпеня 1941 г. | каля 1400 савецкіх танкаў | Страта больш за 50% танкаў |
| Сучасная расійская гістарыяграфія | 6–10 ліпеня 1941 г. | 1300 савецкіх танкаў | 832 танкі |
| Стэльмах А.У. | 6–11 ліпеня 1941 г. | да 1500 танкаў з абодвух бакоў | Каля 60% у жывой сіле і тэхніцы |
| Бяшанаў У.В. | 6–9 ліпеня 1941 г. | больш за 1700 савецкіх танкаў | Механізаваныя карпусы загінулі |
| Ірынархаў Р.С. | 6–9 ліпеня 1941 г. | каля 1400 савецкіх танкаў | Каля 60% у жывой сіле і тэхніцы |

### Альтэрнатыўны погляд на праблему

Альтэрнатыўны погляд на гісторыю Лепельскага контрудару ў апошні час прадстаўляе расійскі гісторык А.Ісаеў[52]. Ён упершыню прапануе высновы, атрыманыя на падставе выкарыстання як новых айчынных, так і замежных дакументаў. Даследчык адзначае, што з савецкага часу ў гістарыяграфіі замацаваліся лічбы, якія не адпавядаюць дакументальным крыніцам. Калі, паводле ваенных мемуараў, у 7-м механізаваным корпусе было 715 танкаў, то, паводле архіўных дакументаў, уведзеных А.Ісаевым, — толькі 507 баявых адзінак[53]. Укамплектаванасць танкавага парку 13-й і 17-й танкавых дывізій 5-га корпуса на момант правядзення Лепельскага контрудару складала 739 машын, тады як, паводле звестак штаба 20-й арміі, гэта лічба даходзіла да 924 баявых машын[54].

Інакш вызначае А.Ісаеў і маштабы Лепельскага контрудару. Ён дакументальна абгрунтоўвае сваю думку пра тое, што пяцідзённыя баявыя дзеянні пад Сянно і Лепелем нельга разглядаць як адзіную баявую аперацыю. На самай справе яна распалася на два самастойныя контрудары, праведзеныя разрознена па месцы і часе: першы — сіламі 7-га механізаванага корпуса з раёна Віцебска ў напрамку Бешанковічы—Лепель; другі — сіламі 5-га механізаванага корпуса з раёна Оршы ў напрамку Сянно—Лепель[55].

Дакументы, уведзеныя А.Ісаевым, сведчаць, што 10 ліпеня нельга лічыць у якасці канчатковай даты аперацыі, паколькі на гэты дзень 5-му і 7-му карпусам была пастаўлена баявая задача нанесці сумесны ўдар у напрамку на Бешанковічы. Але на той момант 5-ы корпус фактычна апынуўся ў акружэнні, і выхад асноўных яго сіл быў завершаны толькі ў сярэдзіне наступнага дня, 11 ліпеня. Гэта азначае, што контрудар ад пачатку і да заканчэння доўжыўся 6 дзён[56].

### Спроба комплекснага аналізу праблемы

З мэтай стварэння комплекснай карціны баявых падзей на лепельскім напрамку прапануем працяг навуковага дыскурсу па тэме. Перш наперш неабходна сказаць некалькі слоў аб Дырэктыве № 16 ад 4 ліпеня 1941 г. У ёй новае камандаванне Заходняга фронту на чале з маршалам С.Цімашэнкам паставіла задачы для вайсковых часцей фронту, у тым ліку ліквідаваць лепельскую групоўку праціўніка, якая наступала з раёна Лепеля, Полацка ў напрамку Віцебска. У штабе 20-й арміі пад камандаваннем генерал-лейтэнанта П.Курачкіна быў распрацаваны план аперацыі, адпаведна якому 7-му МК было загадана наступаць з раёна Віцебска ў напрамку Бешанковічы—Лепель і ў далейшым нанесці ўдар па флангу і ў тыл полацкай групоўкі 3-й танкавай групы праціўніка; 5-му МК — нанесці ўдар у напрамку Сянно—Лепель з мэтай далейшага развіцця ўдару на захад, на Глыбокае і Докшыцы. Такім чынам, 5-ы і 7-ы механізаваныя карпусы павінны былі правесці два самастойныя контрудары па збежных напрамках на Лепель. У якасці тэрміну пераходу ў контрнаступленне было вызначана 5 ліпеня 1941 г.[57].

Што тычыцца ўкамплектаванасці савецкіх танкавых карпусоў баявымі машынамі на момант пачатку нанясення ўдару, прывядзём наступныя даныя *(гл. табліцу 2)*. Адразу ж звернем увагу на карэляцыю даных табліцы і тых, што прыведзены ў журнале баявых дзеянняў 5-га корпуса. Паводле апошняга, корпус прыбыў на фронт, укамлектаваны па штатах мірнага часу. На 5 ліпеня ў ім былі 2 батальёны танкаў БТ-7 (усяго 100 машын), адзін батальён танкаў Т-26 (31 машына) і адзін батальён танкаў ХТ (31 машына). Відавочна, што пры параўнанні даных табліцы і дакумента найбольшая ступень карэляцыі назіраецца толькі ў апошнім выпадку. І адразу ж узнікае пытанне, наколькі ўвесь уліковы штат танкавага парку быў задзейнічаны падчас Лепельскай аперацыі. У танкавым палку 109-й мотастралковай дывізіі па штату знаходзілася 158 танкаў, з якіх на фронт прыбылі толькі 70 танкаў, астатнія 88 танкаў да раёна выгрузкі на ўчастку Смаленск—Орша не дайшлі. Пры гэтым жа згадваецца, што ўсяго 5-ы корпус быў укамплектаваны 802 танкамі[58].

З табліцы бачна, што на момант пачатку баявых дзеянняў агульная колькасць баявых машын двух

*Табліца 2*

**Колькасць танкаў у танкавых дывізіях 5-га (на 7.7.1941 г.) і 7-га (на 6.7.1941 г.) механізаваных карпусоў***

| Тыпы танкаў / № танкавай дывізіі | КВ | Т-34 | БТ-7 | БТ-5 | Т-26 | ХТ | Т-37 | Т-27 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 13-я дывізія | 7 | 10 | 238 | - | 112 | 26 | 20 | - | |
| 17-я дывізія | 6 | 10 | 255 | 4 | 112 | 31 | - | 7 | |
| **Усяго** | **13** | **20** | **493** | **4** | **224** | **57** | **20** | **7** | **838** |
| 14-я дывізія | 24 | 29 | 176 | - | - | 16 | - | - | |
| 18-я дывізія | 10 | - | 11 | - | 187 | 54 | - | - | |
| **Усяго** | **34** | **29** | **187** | - | **187** | **70** | - | - | **507** |

* Табліца складзена паводле: Исаев А.В. Неизвестный 1941. Остановленный блицкриг. М., 2010. С. 334, 347.

*Табліца 3*

**Колькасць танкаў у танкавых дывізіях 3-й танкавай групы (на 1.7.1941 г.)***

| Тыпы танкаў / № ТД | Pz. II | Kpfw. 38 (t) – LT v. 38 | Pz. IV | Камандзірскія (Pz. III) | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| 7-я танкавая дывізія | 32 | 105 | 17 | 8 | 162 |
| 12-я танкавая дывізія | 39 | 94 | 18 | 9 | 160 |
| **Усяго** | **71** | **199** | **35** | **17** | **322** |

* Табліца складзена паводле даных: BA-MA. RH 21-3/732: Panzer AOK 3. Ia Nr. 520/42 geheim: Gefechtsberichte Russland 1941/42, Bl. 13.

механізаваных карпусоў складала 1345 танкаў розных тыпаў, у тым ліку 96 танкаў КВ і Т-34. Таксама неабходна мець на ўвазе, што ў табліцы не ўлічаны 153 бронеаўтамабілі, што знаходзіліся на ўзбраенні 5-га механізаванага корпуса, а таксама 70 танкаў, што прыбылі ў раён Оршы. Даныя табліцы сведчаць, што большасць баявых машын новых тыпаў знаходзілася ў 7-м механізаваным корпусе, а менавіта ў адной з элітных савецкіх часцей — 14-й танкавай дывізіі, у якой ваяваў сын І.Сталіна Я.Джугашвілі**.

Аб колькасці танкаў з нямецкага боку існуюць частковыя звесткі. Паводле захаваных дакументаў, можна скласці наступную карціну аб укамплектаванасці танкамі нямецкіх дывізій да моманту пачатку баявых дзеянняў у раёне Сянно—Лепеля *(гл. табліцу 3)*. З лічбавых даных вынікае, што 5-ы і 7-ы савецкія карпусы значна пераўзыходзілі нямецкія часці па колькасці баявых машын. Пра тое, што ўдзельнікі контрудару мелі ў 3—4 разы больш танкаў, чым немцы, пісаў і былы начальнік штаба 5-га корпуса В.Буткоў. Неабходна, аднак, мець на ўвазе, што агульная маса танкаў не знаходзілася адначасова ў танкавым баі на адной баявой прасторы. Як бачна з дзённікаў баявых дзеянняў савецкіх танкавых дывізій, баі мелі лакальны характар. Пры гэтым танкі новых тыпаў (накшталт савецкага Т-34 ці нямецкага Pz. IV) складалі ўсяго прыкладна дзясятую частку ад агульнай колькасці машын.

Аналіз айчынных і замежных дакументаў дазваляе выявіць тыя аспекты баявых дзеянняў, якія раней заставаліся па-за ўвагай гісторыкаў. Так, звернем увагу на баявое данясенне № 8 камандуючага 20-й арміяй аб выніках баявых дзеянняў 5-га і 7-га механізаваных карпусоў у першыя тры дні з моманту пачатку Лепельскай аперацыі. У ім П.Курачкін дакладаў у Генеральны штаб, што 5-ы і 7-ы карпусы прадаўжаюць выконваць задачу па знішчэнні лепельскай групоўкі праціўніка, наносячы ўдары ў напрамку Сянно, Лепель. Пры гэтым 7-ы МК пад прыкрыццём 153-й стралковай дывізіі і мотастралковых часцей 18-й танкавай дывізіі, якая займала раён Сянно, у 13 гадзін 8 ліпеня пачаў перагрупоўку да левага фланга. У той жа час танкі праціўніка пры падтрымцы авіяцыі атакавалі правы фланг 18-й танкавай дывізіі з лясоў на поўнач ад Сянно і перайшлі ў наступленне, заняўшы Новае Сяло (6 км на ўсход ад Сянно). 5-ы МК да 9 гадзін раніцы заняў зыходнае становішча ў раёне саўгаса Федэратыўны, Лозы, ст. Клімавічы (10—15 км на поўдзень ад Сянно), насупраць 27-й мотадывізіі праціўніка, якая з артылерыяй абаранялася на рубяжы Вяцера, Дзідава. Адбіўшы а 13-й гадзіне на рубяжы Чырвоны Маяк, Азярышча атаку каля 100 танкаў, падтрыманых авіяцыяй, корпус перайшоў у наступленне, прычым 17-я танкавая дывізія на ўчастку Вялікія і Малыя Ліпавічы (20 км на паўднёвы захад ад Сянно) разграміла 36-ы мотастралковы полк 27-й мотадывізіі, знішчыла цяжкую батарэю, тры лёгкія батарэі і пяць супрацьтанкавых гармат. Рэшткі праціўніка на машынах адышлі ў напрамку на Чарэю, іх праследуюць часці 17-й танкавай дывізіі. У гэты ж час 13-я танкавая дывізія ў баях на поўдзень ад Сянно разграміла да двух батальёнаў 34-га мотапалка 27-й мотадывізіі. У якасці баявой задачы наступнага дня быў вызначаны працяг наступлення чатырма дывізіямі двух МК у агульным напрамку на Лепель[59].

Адразу ж звернем увагу на тое, што ў данясенні П.Курачкіна названы нямецкія падраздзяленні, якіх насамрэч не было на гэтым участку баявых дзеянняў. Паводле загаду камандавання 3-й нямецкай танкавай групы, 2 ліпеня чатыры дывізіі (7-я і 12-я танкавыя, 14-я і 20-я матарызаваныя) пачалі наступаць на Веліж праз Дзвіну на ўчастку Віцебск—Полацк[60]. Загад аб наступленні праз Чарэю і Сянно ў напрамку станцыі Коханава атрымала 17-я танкавая дывізія 47-га танкавага корпуса 2-й танкавай групы. Пры гэтым удзел усіх згаданых нямецкіх падраздзяленняў у баявых дзеяннях пад Лепелем не пацвярджаецца дакументальна. Прыведзеныя нямецкія даныя паказваюць памылковасць упамінанняў пра назвы іншых нямецкіх часцей[61]. Заўважым, што і ў нямецкіх дакументах даволі часта фігуруюць даныя разведкі, якія не заўсёды пацвярджаюцца фактамі.

Даволі важным нам падаецца **разгляд баявых дзеянняў, якія адлюстраваны і ў савецкіх, і ў нямецкіх дакументах.**

У якасці першага прыкладу прывядзём баявыя дзеянні савецкай 13-й танкавай дывізіі на працягу 8 ліпеня 1941 г. У публікацыі былога начальніка штаба 5-га механізаванага корпуса В.Буткова баявым падзеям, якія адбыліся на працягу гэтага дня, пры-

** У ходзе адступлення дывізіі 17 ліпеня ў раёне Лёзна ён быў узяты ў палон.

свечаны толькі некалькі радкоў: *"13-я танкавая дывізія ў сваёй паласе правяла пяць атак, але поспеху не мела. У другой палове дня яна не раз падвяргалася ўдарам варожай авіяцыі і была вымушана адмовіцца ад далейшых атак"*[62] .

Рассакрэчаныя дакументы, а менавіта "Падрабязнае апісанне першага бою 13-й танкавай дывізіі ў раёне Толпіна 8.7.41 г."[63], дазваляюць скласці больш падрабязную карціну тых падзей. Да 9.00 раніцы 8 ліпеня 13-й танкавай дывізіі ставілася задача наступаць у напрамку Лукомль і Лепель, знішчыць праціўніка і да зыходу дня авалодаць паўднёвай часткай Лепеля. Выкананне баявой задачы забяспечвалі 25-ы і 26-ы танкавыя палкі, 13-ы мотастралковы полк, 13-ы артылерыйскі полк. Атака пачалася ў 12.00 без артылерыйскай падрыхтоўкі, паколькі да таго моманту артылерыйскі полк, зенітны дывізіён і батальён цяжкіх танкаў знаходзіліся толькі на падыходзе да пазіцый. Першы дывізіён 13-га артылерыйскага палка заняў пазіцыі і адкрыў агонь толькі а 14-й гадзіне, а другі дывізіён дасягнуў раёна агнявой падрыхтоўкі толькі ў 17 гадзін і ўвогуле не ўдзельнічаў у баі.

У раёне Навінкі, Толпіна дывізія сутыкнулася з моцна арганізаванай процітанкавай абаронай. Некалькі танкавых атак на працягу 16.00—20.00 прывялі да вялікіх страт, але поспеху не прынеслі. Значныя страты былі панесены савецкімі войскамі і ў выніку "бесперапыннага ўздзеяння варожай авіяцыі". Цяжкія танкі, якія складалі рэзерв 13-й дывізіі, былі выкліканы на месца бою, але прыбылі толькі ў 20.00. У дакуменце адзначаецца, што часці дывізіі панеслі вялікія страты: 26-ы танкавы полк страціў 47 танкаў, 25-ы — 27, батальён цяжкіх танкаў — 6 танкаў. На наступны дзень, 9 ліпеня, дывізія не вяла баявых дзеянняў, акрамя бамбардзіровак авіяцыі. 10 ліпеня 13-я дывізія апынулася ў нямецкім акружэнні[64] .

"Справаздача аб баявых дзеяннях часцей 17-й танкавай дывізіі з 4.7.41 г. да 19.7.41 г."[65] сведчыць, што галоўнай задачай для гэтай вайсковай адзінкі з'яўляўся захоп Лепеля. На працягу 7 ліпеня 33-і і 34-ы танкавыя палкі дывізіі праводзілі запраўку матэрыяльнай часці палівам, сустрэчы з праціўнікам не мелі. Раніцай 8 ліпеня ў раёне Вялікіх Ліпавічаў удалося захапіць 24 гарматы розных калібраў, 3 танкі, 4 трактары і 3 аўтамашыны. Аднак у 18 гадзін дывізія была атакавана праціўнікам (які меў да 60 танкаў і 600 матацыклістаў), пасля чаго 33-і танкавы полк апынуўся ў акружэнні. З 18.00 да 21.00 нямецкая авіяцыя бесперапынна наносіла ўдары па часцях дывізіі ў раёнах Цэрэбені, Малыя і Вялікія Ліпавічы, таму немагчыма было аказаць дапамогу 33-му палку. 34-ы танкавы полк страціў у выніку баёў 8—10 ліпеня 1941 г. 84 адзінкі баявой тэхнікі і 72 чалавекі (у тым ліку 41 чалавек малодшага і старшага каманднага саставу). Адной з прычын гэтага ў дакуменце называецца адсутнасць своечасовых і дакладных даных ад разведкі. Так, 8 ліпеня 34-ы танкавы полк страціў большую частку сваіх танкаў, паколькі яны завязлі ў балоце і былі знішчаны артылерыйскім агнём праціўніка. У дакуменце таксама адзначаецца, што ў выніку баёў пад Сянно, Ліпавічамі, Лядамі, Софнеўкай і Потавам праціўніку былі нанесены вялізныя страты: 17-я дывізія знішчыла 40 танкаў, 10 бронемашын, 89 грузавых аўтамашын. Асобна заўважым, што, паводле справаздачы, за перыяд з 7.7.41 г. па 5.8.41 г. часці 17-й танкавай дывізіі правялі толькі 4 (!) танкавыя атакі і адзін раз былі атакаваны праціўнікам у колькасці 60 танкаў[66] .

Не менш важнымі ў рассакрэчаных дакументах з'яўляюцца і звесткі аб заключнай частцы баявых дзеянняў, дзе даюцца ацэнкі і падводзяцца некаторыя вынікі. Паводле загада № 1 штаба 20-й арміі, 5-ы механізаваны корпус ва ўзаемадзеянні з 7-м корпусам павінен быў спачатку сканцэнтраваць сілы на левым флангу, а потым ліквідаваць нямецкую групоўку і авалодаць Лепелем да зыходу дня 6 ліпеня 1941 г. У дакуменце запісана, што поўнасцю задачу корпус не выканаў. У ходзе баёў з 8 па 10 ліпеня і 11 ліпеня пры выхадзе з акружэння корпус панёс наступныя страты па танках: у 13-й танкавай дывізіі — 82 адзінкі баявой тэхнікі, у 17-й танкавай дывізіі — 244, у 109-й мотастралковай дывізіі — 40 танкаў. Ад дзеянняў нямецкай авіяцыі было страчана каля 50% танкаў, тады як ад процітанкавай абароны і ў ходзе баёў ад танкаў праціўніка — каля 30%. Яшчэ 20% танкаў выбылі са строю і завязлі ў балотах, паколькі не было магчымасці іх эвакуацыі па прычыне абстрэлу праціўнікам[67] .

Зварот да **нямецкіх дакументаў** дазваляе ўбачыць асобныя падзеі з процілеглага боку. Звернемся да "Дзённіка баявых дзеянняў 17-й нямецкай танкавай дывізіі", якая ўдзельнічала ў баях пад Сянно. Нагадаем, што пад Сянно ўдзельнічала баявая група дывізіі, якая мела 80 танкаў. З дакумента вынікае, што на працягу 6-дзённага (з 5 па 10 ліпеня) баявога рэйду праз Сянно ў напрамку Коханава (паміж Талачынам і Оршай) на полі бою дывізіі было знішчана больш за 250 танкаў 5-га савецкага танкавага кор-

*Табліца 4*

**Захаванасць матэрыяльнай часткі 14-й (на 10.7.41) і 17-й (на 13.7.41) танкавых дывізій***

| Тыпы танкаў / № танкавай дывізіі | КВ | Т-34 | БТ-7 | Т-26 | ХТ | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **14-я танкавая дывізія** | 10 | 7 | 86 | 12 | - | **115** |
| **17-я танкавая дывізія** | 3 | 3 | 75 | 34 | 17 | **132** |
| **Усяго** | **13** | **10** | **161** | **46** | **17** | **247** |

* Табліца складзена паводле даных: Исаев А.В. Неизвестный 1941. Остановленный блицкриг. М., 2010. С. 373.

пуса (з іх прыкладна 150 пры дапамозе авіяцыі). На працягу аднаго дня 8 ліпеня ў раёне Толпіна ў выніку ўпартых баёў было знішчана 68 савецкіх танкаў[68].

Паводле дакумента, савецкае наступленне вялося ў двух напрамках — на Ліпавічы і Толпіна. Яно пачалося з танкавай атакі ў 5.30 раніцы 8 ліпеня, але да 7-й гадзіны было спынена агнём процітанкавай артылерыі. У 8.10 савецкія войскі нанеслі новы моцны ўдар з выкарыстаннем танкаў і стралковых падраздзяленняў, якія наступалі пры актыўнай падтрымцы артылерыі. У выніку гэтага ўдару нямецкі бок апынуўся ў крызіснай сітуацыі і быў вымушаны пачаць адвод сваіх тылавых часцей і маршавых калон з раёна Толпіна ў напрамку Чарэі. Упартыя баі ішлі на працягу ўсёй першай паловы дня 8 ліпеня. У выніку іх савецкаму боку ўдалося прарвацца на паўднёвы захад ад Толпіна і адсекчы нямецкія тылавыя службы ад баявых часцей дывізіі. Толпіна было захоплена 39-м нямецкім танкавым палком толькі ў 21.15.

На наступны дзень, 9 ліпеня, нямецкія войскі планавалі нанесці ўдар на Сянно з мэтай злучыцца з баявымі часцямі, што дзейнічалі ў раёне Абольцаў. Аднак гэтая задача выканана не была, паколькі там былі выяўлены моцныя сілы савецкіх войскаў. Як адзначаецца ў дакуменце, толькі ў другой палове дня немцы нанеслі ўдар у напрамку на Сянно. Каля 17.00 баявая група дывізіі дасягнула Сянно на паўднёвым захадзе. Толькі ў сярэдзіне дня 10 ліпеня 17-я нямецкая танкавая дывізія здолела дасягнуць Коханава[69].

Важным падаецца нам і такі факт вядзення баявых дзеянняў савецкімі і нямецкімі часцямі. Напрыклад, 7 ліпеня ў раёне Дубравы—Гняздзілавічы, дзе паміж Бешанковічамі і Астроўна вяла наступленне 14-я савецкая танкавая дывізія, 7-я мотапяхотная брыгада 7-й нямецкай танкавай дывізіі на працягу аднаго дня знішчыла 103 танкі, у тым ліку 2 танкі КВ і 4 танкі Т-34, тады як самі немцы пры гэтым страцілі 2 танкі, 2 процітанкавыя, 2 лёгкія штурмавыя гарматы, 2 зенітныя гарматы і 2 аўтамабілі[70]. Паводле данясення камандавання 39-га нямецкага армейскага корпуса, 7-я дывізія на працягу баёў пад Віцебскам з 6 па 12 ліпеня знішчыла 198 танкаў, 15 гармат, 14 процітанкавых гармат, 608 аўтамабіляў, 4 самалёты і ўзяла ў палон 620 чалавек. Большая частка трафеяў была ўзята на паўднёвы захад ад Віцебска, каля Сянно і Дубравы. 12-я танкавая дывізія, якая ўступіла ў баявыя дзеянні пад Сянно значна пазней, знішчыла 146 танкаў (большая частка з іх была знішчана ў тым раёне). Усяго 39-м нямецкім армейскім корпусам на Віцебшчыне, у раё-не Улы і каля Віцебска, быў знішчаны 371 танк, з якіх абсалютная большасць у ходзе баёў пад Сянно. (Заўважым, што баявыя дзеянні з удзелам 7-га і 5-га механізаваных карпусоў прадаўжаліся і пасля завяршэння баёў пад Сянно. Так, 14-я танкавая дывізія 7-га МК страціла з 13 па 17 ліпеня ў раёне Лёзна яшчэ 89 танкаў)[71].

На аснове аналізу дзённікаў баявых дзеянняў 7-й, 12-й, 20-й танкавых і 20-й матарызаванай нямецкіх дывізій 3-й танкавай групы, а таксама 17-й танкавай дывізіі 2-й танкавай групы можна падлічыць, што ў ходзе баявых дзеянняў у раёне Дубравы, Бешанковічаў, Сянно, Улы і Віцебска, а таксама Лёзна да сярэдзіны ліпеня 1941 г. былі знішчаны **694** савецкія танкі[72].

Дакладных даных аб стратах у баявой тэхніцы, панесеных 3-й нямецкай танкавай групай, намі пакуль не выяўлена. Вядома толькі, што ў 2-й танкавай групе па стану на 7 ліпеня 1941 г. баяздольнымі лічыліся: у 3-й і 18-й танкавых дывізіях — 35% машын; у 4-й і 17-й (якая ўдзельнічала ў баях пад Сянно) — 60%; у 10-й танкавай дывізіі — 80% машын. Фактычна стратанай за гэты час лічылася кожная 10-я машына[73].

Што тычыцца страт асабовага складу, то яны былі наступныя. Нямецкія войскі страцілі 544 афіцэры (170 загінулі, 366 паранены, 8 прапалі без вестак) і 10 162 унтэр-афіцэраў і радавых (2431 загінулі, 7126 паранены, 605 прапалі без вестак)[74]. Паводле дакументаў 5-га савецкага механізаванага корпуса, у выніку баёў з 8 па 11 ліпеня агульныя страты складалі 646 чалавек (138 забіты і 357 прапалі без вестак)[75].

**Наконт аператыўна-тактычных вынікаў Лепельскай аперацыі**, праведзенай у пачатку ліпеня 1941 г., выказваюцца самыя розныя ацэнкі. У першую чаргу гэта звязана з беззваротнай стратай савецкімі войскамі значнай колькасці танкаў. Некаторыя прычыны гэтага назваў у час допыту ў нямецкім палоне Я.Джугашвілі[76]. Ён даў высокую ацэнку нямецкай танкавай тэхніцы і тактыцы яе выкарыстання на полі бою, адзначыўшы пры гэтым, што няўдачы савецкіх войскаў звязаны не столькі з недахопам тэхнікі ці ўзбраенняў, колькі з няздольнасцю камандзіраў і адсутнасцю ў іх вопыту вядзення манеўранага бою. Такое становішча, на яго думку, стала расплатай за рэпрэсіі супраць вядучага каманднага саставу Чырвонай Арміі, у выніку якіх ні на адным узроўні — брыгады, дывізіі, корпуса — часам не маглі своечасова прыняць правільнага аператыўнага рашэння. Сведчаннем гэтага Я.Джугашвілі называў і наступальную аперацыю, праведзеную савецкім камандаваннем пад Віцебскам. У сітуацыі, калі штабы не мелі сувязі з часцямі і паміж сабой сярод салдат узнікала паніка, камандзіры і камісары вымушаны былі са зброяй у руках стрымліваць тых, хто пакідаў пазіцыі. Таксама Я.Джугашвілі адзначаў, што артылерысты вымушаны былі весці агонь па праціўніку без палявых карт[77].

У гэтым плане падаюцца важнымі і некаторыя іншыя факты, без уліку якіх немагчыма казаць аб стварэнні цэласнай панарамы танкавых баёў на Віцебшчыне летам 1941 г. Звернемся да малавядомага архіўнага дакумента — вынікаў інспектавання, праведзенага па даручэнні камандуючага Заходнім фронтам С.Цімашэнкі членам Ваеннага Савета фронту, першым сакратаром ЦК КП(б)Б П.Панамарэнкам. Падрыхтаваная ў жніўні 1941 г. на імя І.Сталіна дакладная запіска ўтрымлівае шмат важных ацэнак таго, што адбылося ў ходзе правядзення контрудару на лепельскім напрамку. У прыватнасці, была адзначана схільнасць многіх военачальнікаў і камандзі-

дзіраў да дзеянняў "лабавымі ўдарамі", "коннай лавай", "навалам", вядомых з часоў Грамадзянскай вайны. У дакуменце гаворыцца, да чаго прывяла падобная тактыка ў 7-м механізаваным корпусе, які меў 526 танкаў. Так, *"з 9 па 20 ліпеня корпус прайшоў шлях з баямі [у раёне] Рудня — Лёзна — Бешанковічы і назад у Лёзна. У гэтым рэйдзе корпус страціў усе танкі па прычыне таго, што ў першы дзень корпус распачаў без разведкі лабавую атаку на вузел абароны праціўніка, у выніку страціў адразу 100 танкаў. Далей, зноў жа ў выніку адсутнасці разведкі, корпус патрапіў пад перакрыжаваны агонь дзвюх замаскіраваных танкавых калон праціўніка і таксама страціў шмат танкаў. Затым корпус адышоў у балота. Шмат танкаў завязлі, а астатнія былі страчаны па дарогах. Так злачынна быў загублены адзін з моцных карпусоў"*[78].

**Высновы**

Падводзячы высновы, трэба перш за ўсё адзначыць, што Лепельская аперацыя сапраўды вызначалася фактам шырокага выкарыстання танкавых злучэнняў як з савецкага, так і нямецкага боку. Аднак называць тыя падзеі танкавай бітвай пад Сянно можна толькі з улікам наступных фактаў і фактараў.

Па-першае, у саміх дакументах аператыўнага аддзела штаба Заходняга фронту баявыя дзеянні 5-га і 7-га механізаваных карпусоў 20-й арміі былі названы "Лепельскай аперацыяй"[79]. Па-другое, у дакументах не ўдалося выявіць факта адначасовага сутыкнення з двух бакоў буйных мас танкаў, агульная колькасць якіх перавышала б нават 300 адзінак, не кажучы пра лічбы ў амаль 3 тыс. баявых машын. Вывучэнне аператыўных дакументаў танкавых злучэнняў, якія з двух бакоў удзельнічалі ў баях пад Сянно, дазваляюць выявіць баявыя сутыкненні з удзелам аднаго–двух танкавых палкоў агульнай колькасцю ад 150 да 200 баявых адзінак[80]. Па-трэцяе, Лепельская аперацыя фактычна распалася на два самастойныя контрудары, якія, паводле плана, наносіліся па розных напрамках: 7-ы механізаваны корпус у складзе 14-й і 18-й танкавых дывізій наступаў з раёна Віцебска на Бешанковічы–Лепель; 5-ы механізаваны корпус у складзе 13-й і 17-й танкавых і 109-й мотастралковай дывізій наносіў удар з раёна Оршы на Сянно–Лепель. Фактычна контрудары былі праведзены ў названай паслядоўнасці, але з розніцай у два дні. Канчатковай мэтай контрудараў з'яўляўся выхад у раён Лепеля для нанясення ўдару ў фланг і тыл полацкай групоўкі праціўніка. Паводле аператыўнай зводкі Заходняга фронту ад 5 ліпеня 1941 г., войскі фронту наносілі ўдар па праціўніку, маючы толькі адзін агульны напрамак — Лепель[81]. Падчас аперацыі савецкі бок страціў фактычна 75% танкавага парку 5-га і 7-га механізаваных карпусоў, прычым толькі трэцюю частку на полі бою ў ходзе танкавых баёў ці дзейнасці процітанкавай артылерыі праціўніка.

Сярод прычын амаль поўнага разгрому двух механізаваных карпусоў былі як аб'ектыўныя, так і суб'ектыўныя. Даволі дакладную карціну аб прычынах разгрому дае справаздача 13-й танкавай дывізіі, дзе гаворыцца, што ў ходзе бою ў раёне Толпіна два танкавыя і адзін мотастралковы палкі выконвалі загад аб неадкладным уступленні ў бой, але рабілі гэта без артылерыйскай падрыхтоўкі, без узаемадзеяння паміж сабой, без належнай разведкі мясцовасці, без выкарыстання пяхоты, і да таго ж не ў поўным складзе, з парушэннем кіравання і не ў поўнай баявой гатоўнасці[82].

Нягледзячы на тактычныя няўдачы 5-га і 7-га механізаваных карпусоў, загад аб іх адыходзе на зыходныя пазіцыі стаў вынікам не разгрому ў раёне Сянно і Лепеля, а страты 9 ліпеня войскамі Заходняга фронту г. Віцебска. Вялікія страты ў баявой тэхніцы, якія панеслі два савецкія корпусы ў ходзе Лепельскай аперацыі, былі вельмі адчувальныя, але не такія катастрафічныя[83], як гэта было пад Беластокам, Гродна і Мінскам у першыя дні вайны.

Такім чынам, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што адной з актуальных задач беларускай гістарычнай навукі з'яўляецца правядзенне спецыяльнага даследавання аб Лепельскай аперацыі пачатку ліпеня 1941 г., у аснову якога будзе пакладзены прынцып супастаўлення дакументальных крыніц айчыннага і замежнага паходжання. Толькі так можна стварыць аб'ектыўную рэканструкцыю тых важных гістарычных падзей.

---

[1] Открыт памятник танкистам // 7 дней. 2011, 8 сентября. С. 1.

[2] Прохоровка // Великая Отечественная война 1941—1945: энциклопедия. М., 1985. С. 593.

[3] Великая Отечественная война 1941—1945: энциклопедия. М., 1985.

[4] Великая Отечественная война 1941—1945: энциклопедия. М., 2010.

[5] Бутков В.В. Контрудар 5-го механизированного корпуса на лепельском направлении (6—11 июля 1941 года) // Военно-исторический журнал. 1971, № 9. С. 59—65.

[6] История Великой Отечественной войны Советского Союза 1941—1945 (июнь 1941 — ноябрь 1942 г.). М., 1961.

[7] Там жа. С. 40.

[8] Анфилов В.А. Начало Великой Отечественной войны (22 июня — середина июля 1941 года). Военно-исторический очерк. М., 1962. С. 139.

[9] Там жа. С. 141.

[10] Анфилов В.А. Незабываемый сорок первый. 2-е изд., доп. М., 1989. С. 170

[11] Бутков В.В. Контрудар 5-го механизированного корпуса на лепельском направлении (6—11 июля 1941 года). С. 59—65.

[12] Там жа. С. 61.

[13] Там жа. С. 65.

[14] Там жа. С. 63.

[15] Там жа. С. 65.

[16] Чапурнова Л.У. Лепельскі контрудар 1941 // Беларуская ССР: Кароткая энцыклапедыя. Т. 1. Мн., 1978. С. 360; Чапурнова Л.У. Лепельскі контрудар 1941 // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыклапедыя / Рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) і інш. Мн., 1990. С. 301.

[17] Стэльмах А.У. Лепельскі контрудар 1941 года // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Лепельскага раёна. Мн., 1999. С. 190—195.

[18] Иринархов Р.С. «Западный особый...». Мн., 2002.

[19] История Второй мировой войны 1939—1945. В 12 т. Т. 4: Фашистская агрессия против СССР. Крах стратегии «молниеносной войны». М., 1975.

[20] Там жа. С. 46.

[21] Великая Отечественная война Советского Союза 1941—45. Краткая история. М., 1984. С. 62.

[22] Иванов С.П. Штаб армейский, штаб фронтовой. М., 1990.

[23] Там жа. С. 95.

[24] Там жа. С. 96.

[25] Великая Отечественная война, 1941—1945: В 4 кн. Кн. 1: Суровые испытания / А.С.Орлов, А.С.Якушевский, В.Л.Петров и др. М., 1998.

[26] Там жа. С. 147.

[27] Великая Отечественная война 1941—1945 годов. М., 2011.

[28] Там жа. С. 126.

[29] Беларуская Савецкая Энцыплапедыя. У 12 т. Т. 6. Мн., 1972.

[30] Беларуская Савецкая Энцыплапедыя. У 12 т. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка. Мн., 1975.

[31] Там жа. С. 161.

[32] Языковіч Э.Ф., Раманоўскі В.П. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі (ліпень — жнівень 1941 г.) // Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Т. 4: Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938 — 1943 гг.). Мн., 1975. С. 147.

[33] История Белорусской ССР. Мн., 1977. С. 377.

[34] Чапурнова Л.У. Лепельскі контрудар 1941 // Беларуская ССР: Кароткая энцыклапедыя. Т. 1. Мн., 1978.

[35] Там жа. С. 360.

[36] Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945: энцыклапедыя. Мн., 1990. С. 301.

[37] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4. Мн., 1997. С. 351.

[38] Стэльмах А.У. Лепельскі контрудар 1941 года // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Лепельскага раёна. С. 195.

[39] Бешанов В.В. Танковый погром (Куда исчезли 28 тысяч советских танков). Мн., 2000.

[40] Там жа. С. 291—292.

[41] Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945. Мн., 2005.

[42] Там жа. С. 77.

[43] Республика Беларусь: Энциклопедия: В 6 т. Т. 4. Мн., 2007.

[44] Там жа. С. 447.

[45] Ваенная энцыклапедыя Беларусі / рэдкал.: Л.У. Языковіч (гал. рэд.) [і інш.]. Мн., 2010.

[46] Там жа. С. 577—578.

[47] 1941 год: Страна в огне: Очерки. В 2 кн. Кн. 1. М., 2011.

[48] Литвин А.М., Воронкова И.Ю. Битва за Беларусь летом 1941 года // 1941 год: Страна в огне. Кн. 1. С. 378.

[49] Там жа.

[50] Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945. Мн., 2005. С. 35.

[51] Иринархов Р.С. Агония 1941. Кровавые дороги отступления. М., 2011. С. 116—235.

[52] Исаев А.В. Неизвестный 1941. Остановленный блицкриг. М., 2010. С. 329—373.

[53] Там жа. С. 334.

[54] Там жа. С. 347.

[55] Там жа. С. 340.

[56] Там жа. С. 371.

[57] Там жа. С. 340.

[58] Лепельская операция с 6 по 11.7.41 г. // Журнал боевых действий 5 МК. — Центральный архив Министерства обороны Российской Федерации (далей — ЦАМО РФ). Ф. 208, воп. 2511, спр. 80, арк. 102.

[59] 1941: Документы и материалы: К 70-летию Великой Отечественной войны. Выпуск первый в двух томах. Т. 2 / сост.: Ю.А. Никифоров и др. СПб., 2011. С. 325—326.

[60] Федэральны ваенны архіў Германіі (далей ВА-МА). RH 21-3/46: Panzergruppe 3. Abt. I a, v. 9.7.41. Gefechtsbericht vom 30.6.—9.7.41. Bl. 3.

[61] BA-MA. RH 24-47/5: Anlage Nr. 248 zum Kriegstagebuch Nr. 2 des XXXXVII. Pz. Korps: Bericht über Marsch und Kampf der 17. Pz. Division von Borissow über Senno nach Kochanowo v. 11.7.41. Bl. 1.

[62] Бутков В.В. Контрудар 5-го механизированного корпуса на лепельском направлении (6—11 июля 1941 года). С. 64.

[63] Отчет о боевых действиях 13-й танковой дивизии 5 МК за период с 4 по 19.7.41 // ЦАМО РФ. Ф. 208, воп. 2511, спр. 80, арк. 32.

[64] Подробное описание первого боя 13-й танковой дивизии в районе Толпино 8.7.41 // ЦАМО РФ. Ф. 208, воп. 2511, спр. 80, арк. 5—6.

[65] Отчет о действиях частей 17-й танковой дивизии с 4.7.41 по 19.7.41 // ЦАМО РФ. Ф. 208, воп. 2511, спр. 80, арк. 27—32.

[66] Там жа. Арк. 32.

[67] Лепельская операция с 6 по 11.7.41 г. // ЦАМО РФ. Ф. 208, воп. 2511, спр. 80, арк. 111—112.

[68] BA-MA. RH 24-47/5: Anlage Nr. 248 zum Kriegstagebuch Nr. 2 des XXXXVII. Pz. Korps: Bericht über Marsch und Kampf der 17. Pz. Division von Borissow über Senno nach Kochanowo v. 11.7.41. Bl. 6.

[69] Ibidem.

[70] BA-MA. RH 21-3/433: Abschlussbericht über die Panzerkämpfe am 7.7.41 der 7. Panzer—Division, v. 8.7.41. Bl. 294

[71] BA-MA. RH 21-3/433: Generalkommando XXXIX. A.K. Bericht über Gefangene, vernichtete Geräte und Beute seit Beginn der Kamphandlungen v. 8.8.41. Bl. 464—465.

[72] Ibidem. Bl. 464—465.

[73] BA-MA. RH 21-2/927: Meldung der Pz. Gr. 2 an AOK uber einsatzbereite Panzer v. 7.7.41, Bl. 149.

[74] BA-MA. RH 21-3/46: Panzergruppe 3. Gesamtaufstellung der bisher gemeldeten Verluste, Stand vom 13.7.41, Bl. 149.

[75] Лепельская операция с 6 по 11.7.41 г. // ЦАМО РФ. Ф. 208, воп. 2511, спр. 80, арк. 111.

[76] BA-MA. RH 26-26/7a: Vernehmung des gefangenen russischen Oberleutnant Jacob Josifowitsch Dschugaschwili vom 14. Haub. Art. Regiment. Bl. 1—3.

[77] Ibidem. Bl. 1—3.

[78] Платонов Р.П. Белоруссия: известное и неизвестное: По документам Национального архива Республики Беларусь. Мн., 2000. С. 42; Платонов Р.П. О причинах поражения войск Западного фронта в первые месяцы войны (По материалам Национального архива Республики Беларусь) // Беларусь, 22 июня 1941 года: Говорят архивы...: Материалы к заседанию «круглого стола», посвященного 60-летию начала Великой Отечественной войны (июнь 2001 г.) / Отв. ред.-сост. Р.П. Платонов, В.В.Федосов. Мн., 2001. С. 51—65.

[79] Лепельская операция с 6 по 11.7.41 г. // ЦАМО РФ. Ф. 208, воп. 2511, спр. 80, арк. 111.

[80] Там жа. Арк. 111.

[81] 1941: Документы и материалы: К 70-летию Великой Отечественной войны. Выпуск первый в двух томах. Т. 2 / сост.: Ю.А. Никифоров и др. СПб., 2011. С. 276.

[82] Отчет о боевых действиях 13-й танковой дивизии 5 МК за период с 4 по 19.7.41. // ЦАМО РФ. Ф. 208, воп. 2511, спр. 80, арк. 3.

[83] Лепельская операция с 6 по 11.7.41 г. // ЦАМО РФ. Ф. 208, воп. 2511, спр. 80, арк. 111.